*УДК 378.147:005.336.5:811.161.3*
***В. А. Ляшчынская***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# КАМПЕТЭНТНАСНЫ ПАДЫХОД ДА НАВУЧАННЯ МОВЕ

Ключавым агульнанавуковым паняццем лінгвадыдактыкі з’яўляецца паняцце “падыход”. У методыцы навучання мове падыход да навучання яе выступае ў якасці самай агульнай метадалагічнай асновы навучання, характарызуючы існуючыя погляды на прадмет навучання – мову – і магчымасці авалодвання ёю ў працэсе навучання. Падыход – велічыня пераменная, паколькі змест паняцця складаецца ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічных умоў, што складаліся ў грамадстве, ад рэалізуемай на пэўным этапе яго развіцця адукацыйнай палітыкі. Вось чаму ў апошні час вызначаюцца розныя падыходы – дыферэнцыяльны, інтэграцыйны, структурны, ці структурна-семантычны, камунікатыўны, лінгвакраіназнаўчы.

А з пункту гледжання аб’екта навучання мове (мова, маўленне, маўленчая дзейнасць) размяжоўваюць моўны, маўленчы і маўленчадзейнасны падыходы, кожны з якіх мае сваю мэту: моўны падыход ставіць сваёй мэтай засваенне студэнтамі ведаў пра сістэму мовы, правілы функцыянавання яе адзінак, што забяспечвае граматнасць вуснага і пісьмовага маўлення; маўленчы падыход – засваенне ведаў пра сістэму мовы, у тым ліку дзейнасных норм мовы для эфектыўнага іх выкарыстання ў маўленні; маўленча-дзейнасны падыход – засваенне ведаў пра сістэму мовы, якія дзейнічаюць на розных яе узроўнях, авалодванне ўсімі відамі маўленчай дзейнасці для эфектыўных зносін у розных маўленчых сітуацыях.

Адпаведна абранаму падыходу з яго адметнай мэтай вызначаецца і змест навучання, прынцып яго адбору і галоўнага метаду. Моўны падыход вызначаецца выкарыстаннем тлумачальна-ілюстрацыйнага метаду, пры ўжыванні якога разумовая дзейнасць студэнтаў скіравана на запамінанне вучэбнага матэрыялу, а іх творчая актыўнасць мінімальная; маўленчы падыход характарызуецца выкарыстаннем часткова-пошукавага, ці эўрыстычнага метаду, калі студэнты не толькі ўзнаўляюць веды на ўзроўні памяці, але і выкарыстоўваюць іх для вырашэння пэўнай дыдактычнай задачы, да таго ж складаюць уласныя выказванні ў вуснай ці пісьмовай форме; маўленчадзейнасны – рэпрадуктыўны, паколькі яго прымяненне дазваляе студэнтам прымяняць веды ў новай сітуацыі, да таго ж творча прымяняць атрыманыя веды, самастойна іх папаўняць, мяркуе актыўнае засваенне ведаў.

Карэнныя змены моўнай адукацыі новага часу (XXI ст.) звязаны з неабходнасцю трансфармацыі мовы ў педагагічным працэсе з вучэбнага прадмета ў механізм фарміравання асобы, яе менталітэту, разумення прыроды і грамадства. Зразумела, што ў такім выпадку на першае месца выдзяляецца студэнт, а ў будучым яго вучань як моўная асоба. Адпаведна назіраецца пераарыентацыя ў методыцы навучання мове на вучня як суб’екта актыўнай дзейнасці і адпаведна пераасэнсаванне мэты навучання мове – для чаго іх трэба вучыць. Зразумела, што сучасная педагагічная практыка патрабуе ад настаўнікаў дзейнасці, арыентаванай на развіццё асобы навучэнца – свабоднага, самастойнага, адказнага чалавека з высока развітай свядомасцю, здольнага да індывідуальнага асэнсавання жыцця і творчага пераўтварэння сябе, вучыць спосабам дабывання ведаў, фарміруе вучэбную дзейнасць, творчае мысленне школьнікаў.

Да апошняга часу моўнае навучанне было зарыентавана ў першую чаргу на засваенне вучнямі лінгвістычнай тэорыі, засваенне правілаў граматыкі, арфаграфіі і пунктуацыі, але не на развіццё свядомасці і задавальнення патрэб сацыяльнай практыкі, дзе мова выконвае вядучую функцыю як сродак зносін і матэрыялізацыі мыслення. Структурна-сістэмны падыход да вывучэння мовы, уласцівы XX стагоддзю ў навуцы, быў адным з асноўных у распрацаванай метадычнай мадэлі навучання мове і ў школе.

Вызначаючы мэты і змест моўнай адукацыі не з боку лінгвістыкі, а з аксіялагічных пазіцый нашага часу, варта змяніць і падыходы, пазіцыі навучання, ставячы на першае месца асобу вучня, яе запатрабаванні, моўныя здольнасці, неабходныя ёй для актыўнай жыццядзейнасці. І такім падыходам стане асобасны, калі вынік навучання – гэта падрыхтоўка і фарміраванне моўнай асобы, моўнага ядра асобы як інтэгральнай якасці чалавека, без якой ён не можа рэалізаваць сваю грамадзянскую пазіцыю, самарэалізавацца як індывідуальнасць.

Развіццё і навучанне вучняў у школе можа быць скіравана ў адпаведнасці з тымі сукупнымі здольнасцямі і характарыстыкамі чалавека, якія з'яўляюцца складнікамі моўнай асобы як выніку навучання. Таму вывучэнне курса беларускай мовы ў школе, асноўных адзінак мовы неабходна скіроўваць да выпрацоўкі ўменняў і навыкаў іх выкарыстання, іх функцыянавання ў мове, маўленні вучняў, у мове тэкстаў рознай стылёвай прыналежнасці ў вуснай і пісьмовай формах прад'яўлення.

Адпаведна ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў для агульнаадукацыйных устаноў краіны вынікае неабходнасць змен і ўдакладненняў у падыходах да прафесійнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў у гэтым пытанні, ці гэта павінна вырашацца на этапе падрыхтоўкі будучага спецыяліста-філолага, настаўніка беларускай мовы, паколькі прызнана, што ад якасці засваення асноўных відаў падрыхтоўкі пры атрыманні педагагічнай прафесіі залежыць узровень станаўлення агульнапрафесійных кампетэнцый.

Вядома, што кампетэнтнасць – гэта інтэгральная якасць асобы, якая характарызуе гатоўнасць чалавека да эфектыўнай рэалізацыі той ці іншай спецыяльнай ролі (прафесіянала, члена грамадства, грамадзяніна і інш.). А прафесійная кампетэнтнасць – гэта інтэгральная характыстыка асобы як спецыяліста, якая адлюстроўвае не толькі ступень засваення ведаў, выпрацоўкі ўменняў і навыкаў у той ці іншай галіне прафесіянальнай дзейнасці, але і сукупнасць асобасных якасцей, што дэманструюць уменне эфектыўна дзейнічаць у грамадстве.

Кампетэнцыя – вынік адукацыі, што выражаецца ў гатоўнасці чалавека да вырашэння пэўных задач прафесіянальнай і непрафесіянальнай дзейнасці на аснове выкарыстання ім унутраных і знешніх рэсурсаў.

У педагагічнай навуцы выдзяляюцца дзве групы кампетэнцый:

1) тыя, што маюць асобасны характар і прадвызначаюць прафесійны выбар, з'яўляюцца асновай для фарміравання прафесіянальнай матывацыі, светапогляднай пазіцыі педагога;

2) тыя, што адносяцца да ўзроўня камунікатыўнай, прадметнай, інфармацыйнай спецыялізацыі педагога ў межах яго педагагічных кампетэнцый.

З мэтай якаснай і адпаведнай патрабаванням часу падрыхтоўкі студэнтаў да будучай працы, у прыватнасці студэнтаў філалагічнага факультэта да працы ў адукацыйнай установе, важна і неабходна абраць кампетэнтнасны падыход у навучанні студэнтаў мове, тым самым служачы падрыхтоўцы навучэнцаў, іх адказнасці за абраную будучую прафесійную дзейнасць.

Студэнт у час навучання павінен усвядоміць, выпрацаваць прадметныя кампетэнцыі настаўніка беларускай мовы, да якіх адносяцца:

1) ведаць свой прадмет;
2) ведаць педагагічныя прыёмы і метады;
3) ведаць кантэкст (палітычны, заканадаўчы, арганізацыйны, інструкцыйны);
4) ведаць працэсы групавой дынамікі і інш.;
5) карыстацца інфармацыйна-камп'ютарнымі тэхналогіямі;
6) ствараць бяспеку і камфортную атмасферу ў класе;
7) планаваць, кіраваць, каардынаваць работу вучняў;
8) выкарыстоўваць актыўную і падсумоўваючую ацэнку;
9) праводзіць рэфлексію;

10) прызнаць каштоўнасць адукацыі і спрыяць навучанню;

11) мець усведамленне аб індывідуальным характары навучання;

12) мець пазітыўнае стаўленне да зменаў у жыцці, навучанні;

13) мець унутраную патрэбу ў пастаянным развіцці, удасканальванні прафесійнай дзейнасці і інш.

Акрамя таго, варта дадаць кампетэнцыі, якімі павінен аваладаць студэнт за час навучання як будучы спецыяліст адукацыі і якія заключаюцца ў наступным:

1) дапамагаць вучням авалодваць вучэбнымі навыкамі і ўменнямі;

2) выхоўваць каштоўнасна-эмацыянальныя адносіны да роднай мовы, пабуджаць цікаваць да слова, імкнуцца навучыць правільна гаварыць і пісаць на роднай мове;

3) фарміраваць уменне ў вучняў працаваць у супрацоўніцтве, у групе, узаемадзейнічаць з людзьмі, што побач, знаёмымі і незнаёмымі, атрымліваць інфармацыю;

4) развіваць камунікатыўную кампетэнтнасць вучняў у час урокаў і ў пазаўрочнай дзейнасці.

А яшчэ дадамо прадметныя кампетэнцыі вучняў, якія павінен выпрацаваць настаўнік:

1) фарміраванне моўнай кампетэнцыі;

2) фарміраванне маўленчай кампетэнцыі;

3) фарміраванне камунікатыўнай кампэтэнцыі;

4) фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампэтэнцыі.

І тады мэтай навучання беларускай мове ў адукацыйнай установе стане фарміраванне ў студэнтаў цэласнага ўяўлення пра сутнасць сучаснага працэсу навучання беларускай мове і выхавання, аптымальных спосабах дасягнення новых адукацыйных вынікаў, падыходах да педагагічнай дыягностыкі ўзроўня навучання; мэтанакіраванага азнаямлення з праблемамі лінгвадыдактыкі і функцыянальнай накіраванасці навучання беларускай мове, выпрацоўка і ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый для ажыццяўлення працэсу навучання беларускай мове і выхавання беларускамоўнай асобы, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.